# Nikolay Antropov

**Нарадзіўся ў Мінску (Беларусь). Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Кандыдат філалагічных навук. Дацэнт. У Інстытуце мовазнаўства імя Я. Коласа НАН Беларусі працуе з 1991 года; у цяперашні час – вядучы навуковы супрацоўнік сектара этналінгвістыкі і фальклору.**

Сфера навуковых інтарэсаў: славістыка, этымалогія, этналінгвістыка, дыялекталогія, фалькларыстыка.

Удзельнічаў у падрыхтоўцы “Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак”, “Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы” (адказны рэдактар) і інш. Працуе над падрыхтоўкай “Беларускага фальклорна-этналінгвістычнга атласа” (галоўны рэдактар), асобных выпускаў “Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа”. Аўтар каля 250 навуковых работ, значная частка якіх прысвечана праблемам беларускай этналінгвістыкі.

Сябра чатырох камісій пры Міжнародным камітэце славістаў: этымалагічнай (з 2018 – старшыня), этналінгвістычнай, фалькларыстычнай і камісіі “Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа”. З’яўляецца членам рэдкалегій і штатным рэцэнзентам шэрагу перыядычных навуковых выданняў.

Удзельнік некалькіх Міжнародных з’ездаў славістаў, шматлікіх міжнародных навуковых канферэнцый, сімпозіумаў і інш.

Dofinansowano z programu
„Doskonała nauka” (ID 462229)
Ministra Edukacji i Nauki

Ministerstwo
Edukacji i Nauki

